УДК 61:615.1(043.2)
ББК 5:52.82
ISBN 978-985-21-0251-3


***Круковіч А. У., Маргулец П. М.***

# МЕТАДЫ ПРАФІЛАКТЫКІ І ЛЯЧЭННЯ САРДЭЧНА-САСУДЗІСТЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ СЯРОД МОЛАДЗІ З ПРЫМЯНЕННЕМ ФІТАТЭРАПІІ

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Носік А. А***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Паводле даных сайта беларускіх даследаванняў thinktanks.by, на сённяшні дзень Беларусь знаходзіцца на шостым месцы па смяротнасці ад сардэчна-сасудзістых захворванняў у свеце. Амаль у 2,5 мільёна беларусаў сёння адзначаецца схільнасць да дадзенай групы хвароб, што з'яўляецца найбольш частай прачынай смерці не толькі ў Беларусі. Штогод у свеце па гэтай прычыне памірае больш за 17 мільёнаў чалавек. У нашай краіне праблема прафілактыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў набывае ўсё большую вастрыню і значнасць.

Актуальнасць пытання абумоўлена тым, што ў апошнія гады адзначаецца няўхільны рост колькасці хворых маладога ўзросту, у выніку чаго павялічваецца ўзровень смяротнасці і інваліднасці сярод моладзі. Па некаторых дадзеных, сярод дзяцей колькасць выпадкаў набытай паталогіі сэрца павялічылася ў дзесяць разоў.

Прафілактычныя меры, накіраваныя на ўмацаванне сардэчна-сасудзістай сістэмы, дазваляюць папярэдзіць развіццё небяспечных захворванняў. Павелічэнне колькасці хворых ішэмічнай хваробай сэрца, артэрыяльнай гіпертэнзіяй, атэрасклерозам вымагае пастаяннага прыёму хіміяпрэпаратаў. Працяглае іх выкарыстанне прыводзіць да развіцця алергіі на лекі, рэзістэнтнасці да некаторых прэпаратаў, парушэння маторыкі стрававальнага тракту.

Дадзенае даследаванне праводзіцца з мэтай вызначэння мер прафілактыкі і лячэння хвароб сістэмы кровазвароту. Для гэтага неабходна выявіць асноўныя прычыны ўзнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў сярод моладзі; сітэматызаваць звесткі пра лекавыя расліны, што прымяняюцца пры сардэчна-сасудзістых захворваннях.

Практычныя назіранні і атрыманыя даныя аб выкарыстанні лекавых раслін і прэпаратаў з іх у прафілактыцы і лячэнні сардэчна-сасудзістых захворванняў дэманструюць спрыяльнае ўздзеянне лекавых раслін на арганізм чалавека. Пры гэтым ёсць магчымасць выбару і рознага іх спалучэння ў залежнасці ад стану хворага, яго ўзросту і наяўнасці спадарожных захворванняў. Найбольш эфектыўным з'яўляецца спалучэнне рацыянальнага выкарыстання хіміяпрэпаратаў і дадатковага назначэння фітатэрапіі. Гэты накірунак у медыцыне заваёўвае ўсё больш прыхільнікаў сярод кардыёлагаў і ўчастковых урачоў.

Репозиторий БГМУ